СМІ ў Беларусі

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

3 МАЯ 2017 г. СЕРАДА № 82 (28446)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## МЕДЫЯ ЯК ЛЮСТЭРКА СУЧАСНАСЦІ

***Удзельнікам XXI Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «СМІ ў Беларусі»***

Дарагія сябры!

Вітаю ўдзельнікаў, гасцей і арганізатараў XXI Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «СМІ ў Беларусі».

Гэта маштабная падзея мае ў нашай краіне вялікі грамадскі рэзананс. Штогадовая дэманстрацыя магчымасцяў нацыянальных сродкаў масавай інфармацыі пераканаўча сведчыць аб іх значным патэнцыяле.

Прыемна адзначыць традыцыйны ўдзел у выстаўцы прадстаўнікоў СМІ краін блізкага і далёкага замежжа. Перакананы, што правядзенне дыскусій, круглых сталоў, майстар-класаў вядучых журналістаў паслужыць павышэнню прафесійнага майстэрства і далейшаму развіццю дзелавых і творчых кантактаў у сферы сродкаў масавай інфармацыі.

Ад усёй душы жадаю вам плённай працы і поспехаў у рэалізацыі намечаных мэт.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Цяпер на рынку працы дастаткова стабільная сітуацыя. Па апошніх звестках, колькасць занятых у эканоміцы вырасла на 5,6 тыс. чалавек. Ёсць станоўчая дынаміка па росце занятых у эканоміцы і па працаўладкаванні. У далейшым трэба будзе вырашаць праблему дысбалансу попыту і прапановы на рынку працы. Што датычыцца яшчэ адной важнай задачы — стварэння ў 2017 годзе 70 тысяч новых працоўных месцаў, у яе рашэнні таксама назіраецца станоўчая дынаміка: у першым квартале адзначаецца рост колькасці прадпрыемстваў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8681 | ▼ |
| Еўра | 2,0376 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0703 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Птушыная сядзіба



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Святлана АРАЛКІНА, жыхарка вёскі Жорнаўка Бярэзінскага раёна, любіць птушак — і свойскіх, і дзікіх. На яе падворку — і куры, і гусі, і качкі, і індыкі, і перапёлкі, і нават фазаны — усіх болей за сто пяцьдзясят.

А яшчэ — цэлы тузін шпакоўняў, якія змайстраваў і замацаваў яе муж Валерый. З ранку да вечара не змаўкае птушыны двор, гамоніць і свішча на розныя галасы.

■ Цэнтралізаванае тэсціраванне — 2017

## ЧАТЫРЫ ТЭСТЫ І ТРЫ РЭЗЕРВОВЫЯ ДНІ

**Учора ў краіне распачалася рэгістрацыя абітурыентаў на цэнтралізаванае тэсціраванне, якая будзе доўжыцца да 1 чэрвеня ўключна.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Для таго, каб запасціся пропускамі на ЦТ, абітурыентам даецца амаль цэлы месяц, калі на працягу якога яны могуць завітаць у любы найбліжэйшы да іх месца жыхарства пункт рэгістрацыі. Такіх пунктаў па ўсёй краіне 41. Усе яны падключаны да аўтаматызаванай сістэмы «Агульнарэспубліканскі банк звестак удзельнікаў ЦТ». Сістэма працуе па прынцыпе «аднаго акна»: сама шукае свабодныя пасадачныя месцы і падказвае рэгістратару, у якіх навучальных установах можна здаць тыя ці іншыя прадметы. Асабліва гэта актуальна для сталіцы. Аўтаматызаваная сістэма дазваляе падабраць абітурыенту найбольш зручнае для экзамену месца, нават калі той пажадае здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне ў іншым горадзе. Пункты рэгістрацыі будуць працаваць па рабочых днях тыдня з 9.00 да 19.00 і па суботах 13 і 27 мая — з 9.00 да 18.00.

### НА ЭКЗАМЕН — БЕЗ ДЗЕСЯЦІКЛАСНІКАЎ

Летась на цэнтралізаванае тэсціраванне зарэгістраваліся 100 811 чалавек. Сказаць, колькі сёлета знойдзецца ахвотных штурмаваць ВНУ, праблематычна, паколькі выпускнікі школ, ліцэяў і гімназій звычайна складаюць толькі палову ад агульнай колькасці абітурыентаў, а другая палова — гэта выпускнікі прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, выпускнікі папярэдніх гадоў і студэнты малодшых курсаў платнай формы навучання, якія спрабуюць зноў паступіць на бюджэт. А вось у тым, што колькасць здадзеных чалавека-тэстаў павялічыцца, ніхто не сумняваецца. Па-першае, абітурыентам упершыню прадастаўлена права здаваць на ЦТ чатыры дысцыпліны замест трох. І, можна не сумнявацца, што многія дадатковым шанцам абавязкова скарыстаюцца. Ці зробяць гэта хоць бы з цікаўнасці, тым больш што і сертыфікаты ЦТ цяпер дзейнічаюць два гады. Калі малады чалавек канчаткова вызначыўся з профілем навучання, ён можа здаць цэнтралізаванае тэсціраванне па дзвюх дзяржаўных мовах, а пазней выбраць лепшы з двух сертыфікатаў, забяспечыўшы сабе хоць некалькі дадатковых балаў. Праўда, у прыёмную камісію ВНУ трэба будзе падаваць, як і раней, толькі тры сертыфікаты і два сертыфікаты — у прыёмную камісію ССНУ.

Зарэгістравацца больш чым на чатыры дысцыпліны на ЦТ аўтаматызаваная праграма рэгістрацыі не дазволіць. Як і не дазволіць яна трапіць на ЦТ дзесяцікласнікам.

СТАР. 4

■ Надвор'е

## Вецер з поўначы

### Сярэдняя тэмпература паветра ў першай дэкадзе мая прагназуецца на 2 градусы ніжэйшая за норму

**Даволі халоднае надвор'е чакаецца на тэрыторыі Беларусі на гэтым тыдні, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

У чацвер і ўдзень пераважна па паўднёва-заходняй частцы Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы ад нуля да плюс 7 градусаў, па паўднёвым захадзе 8—10 цяпла. Удзень ад плюс 7 да плюс 14 градусаў, а па паўднёвым усходзе — 15—18 цяпла.

У пятніцу пераважна па паўднёва-заходняй частцы пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы ад нуля да плюс 7 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны — 8—10 цяпла, па Віцебскай вобласці магчымы замаразкі ад нуля да мінус 2 градусаў. Удзень ад плюс 10 да плюс 17 градусаў, па поўдні — да 18 цяпла.

У суботу ўначы ў некаторых раёнах, а ўдзень пераважна па поўдні Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—9 цяпла, удзень — ад плюс 10 да плюс 17 градусаў, па поўдні — да 20 цяпла. У нядзелю ў некаторых раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла, удзень — ад плюс 8 да плюс 14 градусаў, а па поўдні — да 17 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# КОЖНЫ ПАРТНЁР ВАЖНЫ

## Даверчыя лісты Прэзідэнту ўручылі паслы 12 дзяржаў

**Наша краіна праводзіць актыўную знешнюю палітыку, для Беларусі няма нецікавых партнёраў. Літаральна кожная дзяржава свету ўяўляе для нас пэўны інтарэс, амаль для кожнай у нас ёсць што прапанаваць.**

— У штогадовым Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу мною выразна абазначаны шляхі далейшага развіцця краіны і павышэння дабрабыту грамадзян, — нагадаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў пачатку мерапрыемства. — Менавіта на дасягненне гэтай мэты перш за ўсё накіравана наша знешняя палітыка.

Зараз Беларусь старшынствуе ў Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятыве. Прэзідэнт Беларусі ўпэўнены: дзякуючы гэтаму ў нас з'явілася новыя магчымасці для больш шырокага ўцягнення дзяржавы ў еўрапейскія інтэграцыйныя працэсы. Не выпадкова «тытульнай» тэмай беларускага старшынства выбрана прасоўванне сумяшчальнасці ва ў Вялікай Еўропе.

— Пагадзіцеся, у кантэксце цяперашняй нестабільнай абстаноўкі і беспрэцэдэнтных выклікаў яна мае асаблівае значэнне, — адзначыў беларускі лідар. — Бягучы год знамянальны тым, што ў Мінску пройдзе сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Падзея для нашай краіны, ды і для ўсёй Еўропы, важная і дужа адказная. На сесіі плануецца абмеркаваць пытанні ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва ў рэгіёне АБСЕ. Прымаючы высокі форум, Беларусь мае магчымасць пачаць канструктыўны дыялог з прадстаўнікамі многіх еўрапейскіх дзяржаў.

Беларусь у стане забяспечыць замежным партнёрам выхад на велізарны рынак Еўразійскага эканамічнага саюза. Па словах кіраўніка беларускай дзяржавы, гэта, несумненна, павышае яе прыцягальнасць у гандлёва-эканамічным і інвестыцыйным плане.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў замежным дыпламатам, што бягучы год аб'яўлены ў нашай краіне Годам навукі:

— Задачы пастаўлены грандыёзныя. Па прыярытэтных для сябе кірунках даследаванняў Беларусь плануе праз дзясятак гадоў увайсці ў лік дзяржаў-лідараў. У нас захавалася і развіваецца магутная акадэмічная навука, прадстаўленая дзясяткамі буйных даследчых цэнтраў і вышэйшых навучальных устаноў. Спадзяёмся на вашу актыўную дапамогу ў арганізацыі навуковага і студэнцкага абмену, наладжванні ўніверсітэцкіх сувязяў і рэалізацыі сумесных навукова-тэхнічных праектаў.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу: у гэтай зале прадстаўлены амаль усе рэгіёны свету.

— Беларусь высока цэніць партнёрства з вашымі краінамі, — запэўніў ён. — Мы гатовы прымаць вас на ўсіх узроўнях і забяспечваць спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі канструктыўных ідэй і прапаноў.

Даверчыя лісты кіраўніку дзяржавы ўручылі паслы Азербайджана, Ірана, Бельгіі, Нідэрландаў, Нарвегіі, Новай Зеландыі, Мальтыйскага Ордэна, Арменіі, Грэцыі, Руанды, Ізраіля, Украіны.

— Беларусы здаўна жывуць у добрасуседстве з украінцамі, — адзначыў Прэзідэнт. — Нас аб'ядноўвае шматвекавая гісторыя, падобная культура, а таксама вельмі шчыльныя эканамічныя сувязі. Прадставіўшы мінскую перамоўную пляцоўку для ўрэгулявання сітуацыі ва ўсходняй Украіне, мы будзем рабіць усё неабходнае для аднаўлення там міру і спакою. У гэтым плане вы нам можаце давяраць.

Як адзначыў беларускі лідар, Беларусь зайсёды выбудоўвала адносіны з Азербайджанам у духу сяброўства і ўзаемапавагі. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што сумеснымі намаганнямі рэалізаваны шэраг буйных праектаў у галіне вытворчай кааперацыі. Трэба максімальна выкарыстоўваць той патэнцыял, які ёсць, і рухацца далей у гэтым кірунку.

Развіццё двухбаковага супрацоўніцтва з Арменіяй для нас уяўляе асаблівы інтарэс. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу: партнёрства ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза адкрывае новыя магчымасці для павелічэння нашага тавараабароту, дыверсіфікацыі паставак і ўвогуле развіцця і паглыблення адносін.

З задавальненнем кіраўнік краіны адзначыў актывізацыю кантактаў на палітычным і гандлёва-эканамічным узроўнях з Бельгіяй. Наша дзяржава гатова працягнуць рэалізацыю сумесных праектаў у лагістыцы, энергетыцы, хімічнай і харчовай прамысловасці...

— Узаемавыгадныя сувязі беларускі бок мае намер развіваць з Грэчаскай Рэспублікай, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Значны патэнцыял для іх пашырэння маецца ў гандлёва-эканамічнай галіне. Для гэтага сумеснымі намаганнямі нам неабходна выпрацаваць доўгатэрміновыя механізмы і эфектыўныя інструменты супрацоўніцтва.

Па словах Прэзідэнта, канструктыўны характар маюць адносіны Беларусі з Мальтыйскім Ордэнам. Ён выказаў словы падзякі за тую ролю, якую адыгрывае гэта краіна, удзельнічаючы ў рэалізацыі рознага кшталту гуманітарных праектаў у Беларусі.

— У дзясятку асноўных эканамічных партнёраў Беларусі традыцыйна ўваходзяць Нідэрланды. Мы падтрымліваем рашэнне аб адкрыцці аддзялення вашага Пасольства ў Мінску. Мяркую, што больш блізкае знаёмства нідэрландскіх дыпламатаў з нашай краінай самым станоўчым чынам паўплывае на ўмацаванне нашых сяброўскіх сувязяў, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Разам з тым наша краіна зацікаўлена ў адкрытым і ўзаемапаважлівым дыялогу з Нарвегіяй, якая з'яўляецца адным з найбуйнейшых імпарцёраў нашай прадукцыі сярод скандынаўскіх краін. Разам з тым узаемны гандаль можна пашырыць.

— З прыбыццём у Мінск Пасла Дзяржавы Ізраіль мы ўскладаем вялікія надзеі на каапераванне ў галіне высокіх тэхналогій, адукацыі, аховы здароўя, навукі і культуры, — сказаў Прэзідэнт. — Тут у нас з вамі дастаткова памочнікаў, бо многіх беларусаў і ізраільцян аб'ядноўваюць цесныя, часам сямейныя сувязі.

Вітаючы назначэнне новага Пасла Ірана, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: гэта краіна з'яўляецца важным партнёрам Беларусі ў Азіяцкім рэгіёне. У выбудоўванні адносін з Новай Зеландыяй Беларусь гатова падтрымаць з задавальненнем любыя ініцыятывы з боку гэтай краіны. Што да супрацоўніцтва з Руандай, то, як звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, тут ёсць «нерэалізаваныя магчымасці ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, адукацыі».

Напрыканцы Прэзідэнт пажадаў паслам поспехаў у выкананні высокай дыпламатычнай місіі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## Рэформы — толькі дзеля ўдасканалення

**У Палацы Незалежнасці прайшла нарада па ўдасканаленні прававога рэгулявання ў асобных сферах эканамічнай дзейнасці з удзелам Прэзідэнта Беларусі. Быў разгледжаны шэраг праектаў, нарматыўных актаў, скіраваных на ўдасканаленне заканадаўства ў асобных сферах эканомікі краіны.**

Гутарка ішла пра ўвядзенне на фінансавым рынку новага, дадатковага механізма пагашэння даўгоў, а таксама аб увядзенні сучасных формаў уліку плацяжоў у транспартнай сферы. Акрамя гэтага, прапаноўваліся навацыі па абароце тытунёвых вырабаў і электронных цыгарэт.

— Прадстаўленыя прававыя акты закранаюць дастаткова шырокае кола прадпрыемстваў, фінансавых структур і непасрэдна — што самае важнае — нашых грамадзян, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Таму, перш чым прыняць рашэнне па гэтых дакументах, нам неабходна абмеркаваць іх непасрэдна са спецыялістамі, якія іх рыхтавалі.

У гэтай сувязі Прэзідэнт заявіў, што хоча атрымаць выразныя адказы на шэраг пытанняў:

— Па-першае, якія прапануюцца навацыі і ў чым іх сутнасць? Па-другое, які чакаецца эканамічны і сацыяльны эфект для дзяржавы і чалавека? Па-трэцяе, наколькі прапануемыя дакументы сістэмныя? Ці не прыйдзецца ў хуткім часе зноў уносіць у іх змены, дапаўненні, а то і ўвогуле адмяняць і прымаць іншыя нарматыўна-прававыя акты?

Аляксандр Лукашэнка цікавіўся і эканамічным эфектам ад прыняцця разглядаемых дакументаў, актуальнасцю абмяркоўваемых пытанняў.

— Яшчэ раз падкрэсліваю: мне не патрэбны ніякія рэформы дзеля рэформаў, — заявіў Прэзідэнт. — Калі гэта рэформа, то гэта ўдасканаленне. Калі патрэбна карэнная нейкая ломка, без удасканалення — абгрунтуйце.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ВЫРАС БЮДЖЭТ ПРАЖЫТКОВАГА МІНІМУМУ

**У Беларусі з 1 мая вырас бюджэт пражытковага мінімуму і, адпаведна, прапарцыянальна змяніліся аднаразовыя дапамогі пры нараджэнні дзяцей. Гэтыя змены будуць дзейнічаць у перыяд з 1 мая па 31 ліпеня гэтага года.**

Памеры БПМ цяпер складаюць:
— у сярэднім на душу насельніцтва — 183 руб. 82 кап.;
— для працаздольнага насельніцтва — 204 руб. 35 кап.;
— для пенсіянераў — 141 руб. 50 кап.;
— для студэнтаў — 178 руб. 66 кап;
— для дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — 119 руб. 55 кап.;
— для дзяцей ва ўзросце ад трох да шасці гадоў —163 руб. 83 кап.;
— для дзяцей ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў — 201 руб. 5 кап.

У сувязі са змяненнем БПМ павялічыліся мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, надбаўкі, павышэнні да пенсій і даплаты асобам ва ўзросце 75 гадоў і вышэй, якія атрымліваюць пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, а таксама дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

Павялічыліся і дапамогі на дзяцей: пры нараджэнні дзіцяці (першага дзіцяці — 10 БПМ, другога і наступных дзяцей — 14 БПМ); па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў (1 БПМ); на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў (0,5 БПМ), на дзяцей старэйшых за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў (0,5 БПМ, 0,7 БПМ), на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека (0,7 БПМ), а таксама іншыя сацыяльныя выплаты, якія вылічаюцца з памеру БПМ.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Прэм'ер Францыі: ЕС пасля Brexit не вытрымае новага ўдару ў выглядзе перамогі Ле Пен на выбарах

Такое меркаванне Бернар Казнёў выказаў у аўтарскай калонцы для спецыяльнага выпуску газеты «Ліберасьён», накіраванага супраць «Нацыянальнага фронту».

«ЕС, аслаблены выхадам Вялікабрытаніі са свайго складу, не зможа вытрымаць новы ўдар у выглядзе прыходу да ўлады ў Францыі ўрада з адкрыта еўрафобнай пазіцыяй», — цытуе агенцтва Reuters вытрымкі з заявы французскага прэм'ера. Палітык таксама паўтарыў свой заклік галасаваць за заснавальніка руху «На марш», цэнтрыста Эмануэля Макрона ў другім туры выбараў у краіне 7 мая.

### Трамп заявіў, што гатовы сустрэцца з Кім Чэн Ынам



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп гатовы асабіста сустрэцца з лідарам КНДР Кім Чэн Ынам, калі гэта будзе мэтазгодна. Ён пацвердзіў гэта ў інтэрв'ю службе навін Bloomberg.

«Калі б для мяне было мэтазгодна з ім сустрэцца, то я б абсалютна, для мяне гэта было б гонарам», — сказаў амерыканскі прэзідэнт у сваёй звыклай манеры, не дагаворваючы цалкам прапановы. З кантэксту відаць, што ён абсалютна дакладна гатовы быў бы правесці такую сустрэчу.

Служба Bloomberg падкрэслівае, што словы прагучалі на фоне «напружанасці вакол ядзернай праграмы» Пхеньяна, якая нарастае. Яна таксама сцвярджае, што Кім Чэн Ын яшчэ ні разу не сустракаўся ні з кім з замежных лідараў і не пакідаў межы сваёй краіны з часу скону яго бацькі.

«Большасць людзей, якія займаюцца палітыкай, ніколі б так не сказалі, але я вам кажу, што пры адпаведных умовах я б з ім сустрэўся», — заявіў Трамп.

### Пуцін падпісаў закон аб забароне імёнаў з лічбаў, знакаў і ненарматыўнай лексікі

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін падпісаў закон аб забароне рэгістраваць у органах загс імёны, якія складаюцца з лічбаў, знакаў і ненарматыўнай лексікі, а таксама тыя, якія змяшчаюць указанні на рангі і тытулы, інфармуе ТАСС.

«Забараняецца запіс імя дзіцяці, якое складаецца з лічбаў, літарна-лічбавых абазначэнняў, лічэбнікаў, знакаў, за выключэннем знака «злучок», або іх любой камбінацыі альбо ненарматыўных слоў, указанняў на рангі, пасады, тытулы», — адзначаецца ў дакуменце.

Аўтарам законапраекта выступіла сенатар Валянціна Пятрэнка. Яна прыводзіла статыстыку органаў загса Масквы з 1998 года. Паводле гэтых звестак, сярод самых незвычайных імёнаў, якія атрымалі хлопчыкі, былі Мікалай-Мікіта-Ніл, Дэльфін, Яраслаў-Лютабор. У дзяўчынак — Паліна-Паліна, Прынцэса Даніэла, Зара-Зараніца, Алёша-Капрына, Акіян, Сафія-Сонейка.

# ЗАМЕЖНЫ ПОГЛЯД

## Працягваецца візіт дэлегацыі кітайскіх журналістаў у Беларусь

**Учора дэлегацыя замежных гасцей, якая прыбыла ў Беларусь 1 мая, наведала заводы «БелДжы», «БелАЗ» і індустрыяльны парк «Вялікі камень». За дзень да гэтага журналісты ўсклалі кветкі да помніка на мемарыяльным комплексе «Курган Славы».**

Нагадаем, што сумесны беларуска-кітайскі праект «БелДжы», па сутнасці, лічыцца пачаткам легкавога машынабудавання ў нашай краіне. Заснаваны ў канцы 2011 года, сёння завод выпускае тры мадэлі аўтамабіляў: седан, хэтчбэк і гарадскі красовер. Для нарошчвання вытворчых магутнасцяў паміж Барысавам і Жодзінам будуецца новае сучаснае прадпрыемства, якое зможа выпускаць каля 120 тысяч аўтамабіляў у год.

Індустрыяльны парк «Вялікі камень» размяшчаецца за 25 кіламетраў ад Мінска. Сёння на яго тэрыторыі ўзводзіцца высокатэхналагічныя і экспартна арыентаваныя вытворчасці. Акрамя прадпрыемстваў, будуюцца офісныя і гандлёва-забаўляльныя комплексы, жылыя дамы, транспартныя аб'екты. Кітайскія журналісты выказалі сур'ёзную зацікаўленасць да сумесных праектаў Беларусі і Кітая і падкрэслілі важнасць падобнага супрацоўніцтва.

Сярод удзельнікаў дэлегацыі — прадстаўнікі каля 40 выданняў: журналісты электронных сродкаў масавай інфармацыі, тэлевізійшчыкі, работнікі інфармацыйных агенцтваў і іншыя. Яны прабудуць у Беларусі да 7 мая.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ Не абмініце

СМІ ў Беларусі

# ВАЖНА АПРАЎДАЦЬ ДАВЕР

## Сёння распачынае работу XXI Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «СМІ ў Беларусі»

**Рэспубліканскія і рэгіянальныя газеты, глянцавыя і навуковыя часопісы, тэлеканалы і радыёстанцыі — традыцыйна выстаўка «СМІ ў Беларусі» пад адным дахам выставачнага павільёна «БЕЛЭКСПА», размешчанага ў сталіцы па адрасе пр-т Пераможцаў, 14, збірае прафесіяналаў галіны, журналістаў, экспертаў, якія штодзень распавядаюць беларусам пра падзеі ў краіне і свеце. У якасці арганізатараў выстаўкі выступілі Міністэрства інфармацыі, НВЦ «БЕЛЭКСПА» пры падтрымцы Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, Саюза выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку, Дома прэсы і Беларускага саюза журналістаў. Спецыяльнымі гасцямі форуму сталі сродкі масавай інфармацыі Кітая.**

Адметна, што сёлета выстаўка праходзіць пад дэвізам «Нам давяраюць!». Ён вызначыў і асноўны кірунак праграмы для спецыялістаў галіны. Так, ужо сёння адбудзецца канферэнцыя «СМІ ў свеце, які змяняецца. Прафесіяналізм і адказнасць», а цягам усіх чатырох дзён работы форуму падчас пасяджэнняў, круглых сталоў, проста сустрэч у кулуарах будуць абмяркоўвацца пытанні журналісцкай этыкі, ролі СМІ ў фарміраванні грамадскай думкі, захаванні міру ў нашым неспакойным свеце.

Не застануцца без увагі і важная сёлета тэма 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, а таксама актуальныя пытанні работы СМІ ў сацыяльных сетках, новыя тэхналогіі, якія дапамагаюць сустрэчы выданняў і чытача.

Традыцыйна багатую праграму для наведвальнікаў падрыхтаваў Выдавецкі дом «Звязда». Ужо сёння з 15 да 16 гадзін на галоўнай сцэне пройдзе прэзентацыя ўсіх перыядычных выданняў нашага Выдавецкага дома. Пісьменнікам, журналістам і перакладчыкам дапамогуць барды, гумарысты, ансамбль народнай музыкі «Баравічанка», а таксама спявак Дзмітрый Качароўскі і скрыпачка Маймуна. Яркі акцэнт падчас прэзентацыі будзе зроблены на 100-годдзі «Звязды», якое мы адзначым сёлета ў жніўні.

Заўтра, 4 мая, пройдзе круглы стол «Роля мясцовага самакіравання ў грамадскім і сацыяльна-эканамічным жыцці рэгіёнаў», дзе адбудзецца прэзентацыя звяздоўскага праекта «Мясцовае самакіраванне». Удзел у абмеркаванні прымуць прадстаўнікі Нацыянальнага сходу, выкладчыкі і студэнты Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, дэпутаты рэгіянальных Саветаў.

Адметна, што 4 і 5 мая з 14 да 15 гадзін на нашым стэндзе можна будзе атрымаць бясплатную кансультацыю натарыуса з Беларускай натарыяльнай палаты. А 5 мая з 16.30 да 17.30 запрашаем у канферэнц-залу выставачнага павільёна на гутарку пра здаровае харчаванне. У ёй возьме ўдзел урач-гігіеніст Мінскага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Валянціна Цярэшка.

Не застануцца без увагі і дзеткі. Так, заўтра з 11 да 12 гадзін на нашым стэндзе будзе праходзіць майстар-клас ад экамайстэрні «Юнага натураліста». Тут пойдзе гаворка пра незвычайнае ў целе чалавека, нашы слабасці і суперздольнасці, а таксама тыя працэсы, што адбываюцца з намі кожны дзень.

Аматараў гісторыі запрашаем заўтра ў 17.00 у канферэнц-залу. Тут вядомы экскурсавод Павел Дзюсекаў правядзе лекцыю «Вандроўкі ў мінулае: Мінск на старых фотаздымках», прысвечаную 950-годдзю сталіцы.

Мы падрыхтавалі яшчэ шмат сюрпрызаў і падарункаў. Так, запланаваныя прэзентацыі, акцыі і віктарыны. Тыя, хто на нашым стэндзе 3, 4 ці 5 мая з 13 да 14 гадзін падпішацца на часопіс гумару «Вожык», атрымаюць шарж у падарунак, а аматары анекдотаў — адзін з выпускаў.

Завітвайце да нас. Абяцаем: будзе цікава.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ На слыху

## У Слоніме жорстка забітыя скульптар Леанід Богдан і яго жонка

**Трагедыя адбылася каля апоўначы 30 красавіка. У забойстве падазраецца родны ўнук ахвяр — 16-гадовы вучань 11 класа Слонімскай гімназіі. Як паведамляе сайт УУС Гродзенскага аблвыканкама, хлопец кінуўся з нажом спачатку на бабулю (1956 года нараджэння), а затым на дзеда (1953 года нараджэння).**

Жанчына не вытрымала ўдараў нажом і металічным саўком, якія ўзяў на ўзбраенне хлопец, яна памерла на месцы. Дзед у гэты час сцякаў крывёй, але яшчэ заставаўся жывы. Ён прасіў свайго ўнука, каб той выклікаў «хуткую дапамогу», але замест гэтага ўнук збегаў у гараж па сякеру і ёю дабіў дзеда. Адзенне і сякеру хлопец выкінуў у балота каля ракі Шчара.

Пра забойства дзядулі і бабулі ўнук расказаў раніцай святару Свята-Троіцкага сабора. Але агучыў іншую версію: у дом уварваліся рабаўнікі ў чорных масках, якія і здзейснілі злачынства.

— Калі на месца прыехалі супрацоўнікі міліцыі, яны ўстанавілі, што ніякіх рабаўнікоў не было, — паведаміў «Звяздзе» **начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама Яўген ДУДКО.** — У забойстве пенсіянераў падазраецца іх унук. Ён затрыманы, праводзіцца следчы эксперымент на месцы злачынства, пасля чаго падазраваны будзе праходзіць псіхіятрычную экспертызу.

Забойства выклікала шырокі рэзананс у Слоніме. Сям'я скульптара — добра вядомая ў горадзе. Леанід Богдан падарыў гораду нямала сваіх работ. Сярод іх выявы Францыска Скарыны, паэтаў-землякоў Валянціна Таўлая, Анатоля Іверса, Алега Лойкі. А нядаўна ім быў зроблены мемарыяльны камень, які ўсталяваны на месцы слонімскага замчышча.

Па словах затрыманага юнака, нагодай для трагедыі стала электронная цыгарэта, якую ў непаўналетняга знайшоў дзед. Родныя вырашылі, што гэта наркотык, і сталі дапытвацца і дакараць унука, што таму не спадабалася, а пазней прывяло да крывавай развязкі.

Хлопец жыў з дзедам і бабуляй. Яго маці з'ехала ў Арабскія Эміраты і мае там іншую сям'ю. Бацька жыве ў Мінску і вядзе ўласны бізнес.

Калега — журналіст са Слоніма паведаміў «Звяздзе», што хлопец некалькі разоў ездзіў у Эміраты да маці, і нават заяўляў, што хоча пераехаць да яе. Наколькі ён быў праблемным, калега не бярэцца сказаць, але пытанні, на яго думку, па ім былі. Сёлета хлопец павінен быў скончыць гімназію. Вучыўся нядрэнна, з сярэднім балам «7».

Па словах Яўгена Дудко, узбуджана крымінальная справа па артыкуле 139, ч. 2 Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь. Забойства дзвюх асоб класіфікуецца тэрмінам пакарання ад 8 да 25 гадоў альбо пажыццёвым зняволеннем. Адказнасць па гэтым артыкуле наступае з 14 гадоў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

■ Прававая дапамога

## Натарыусы, адвакаты і юрысты бясплатна

**Як скласці завяшчанне ці шлюбны дагавор, атрымаць спадчыну ці вярнуць доўг, дабіцца выканання судовай пастановы ці абараніцца ад шумных суседзяў? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні працоўнага, сямейнага, жыллёвага і зямельнага права можна бясплатна атрымаць падчас выстаўкі «СМІ ў Беларусі» і тэматычных акцый у сталіцы.**

4 і 5 мая з 14 да 15 гадзін у межах сумеснай акцыі Беларускай натарыяльнай палаты і рэдакцыі газеты «Звязда» натарыусы Мінскай абласной і гарадской натарыяльных акруг бясплатна правядуць кансультацыю на XXI Міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы «СМІ ў Беларусі» каля стэнда Выдавецкага дома «Звязда». А 6 мая спецыялісты Міністэрства юстыцыі, Рэспубліканскай калегіі адвакатаў і Беларускай натарыяльнай палаты з 11 да 13 гадзін сустрэнуцца з грамадзянамі ў будынку Міністэрства юстыцыі (вул. Калектарная, 10).

Акцыя прысвечана 72-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, і для ветэранаў створаны спецыяльныя ўмовы для атрымання праваой дапамогі. Яны могуць загадзя зарэгістравацца па тэлефонах: 8 (017) 200 97 55 або 8 (017) 200 03 84. Ветэраны атрымаюць кансультацыю, а пры неабходнасці спецыялісты прыедуць да іх дахаты.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

## На прыгарадным транспарце — за палову кошту

**Пачынаючы з 1 мая і па 30 верасня пенсіянеры могуць ездзіць у прыгарадных аўтобусах і электрацягніках рэгіянальных ліній эканомкласа па льготным тарыфе. Кошт праезду для іх цяпер складае 50% ад поўнага кошту білета.**

На сённяшні дзень скарыстацца гэтай ільготай могуць мужчыны старэйшыя за 60,6 года і жанчыны старэйшыя за 55,6 года. Для таго каб купіць праязны білет са скідкай, ім трэба прад'явіць у касе арыгінал пенсійнага пасведчання.

Пры гэтым зніжкі не дзейнічаюць пры праездзе ў электрацягніках рэгіянальных ліній бізнес-класа і ў цягніках гарадскіх ліній.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## У НІЗІНАХ МАГЧЫМА ВЫМАКАННЕ ПАСЕВАЎ

**Намеснік начальніка службы гідралогіі і аграметэаралогіі Белгідраметцэнтра Надзея МЕЛЬЧАКОВА** паведаміла, што стан азімых нядрэнны, але ў сувязі з працяглым халодным надвор'ем развіццё культур ідзе павольна і адстае ад мінулагодніх тэрмінаў. З-за вялікай колькасці ападкаў, якія выпалі на нізінных участках, магчыма вымаканне пасеваў на невялікіх плошчах. Акрамя таго, лішак вільгаці і паніжаныя тэмпературы правакуюць развіццё хвароб на пасевах.

Эксперты адзначаюць, што нізкія тэмпературы не выклікалі маштабных пашкоджанняў сельскагаспадарчых культур. Аднак на поўдні краіны пацярпелі пладовыя. Ёсць невялікія пашкоджанні азімага рапсу, але гэта не павінна адбіцца на ягоі прадукцыйнасці.

Найбольш складаная сітуацыя з яравымі збожжавымі назіраецца ў Віцебскай вобласці. Там лішак глебавай вільгаці не дазваляе завяршыць сяўбу нават ранніх яравых збожжавых культур. Акрамя таго, празмернасць вільгаці і паніжаная тэмпература затрымліваюць прарастанне збожжа і з'яўленне ўсходаў на засеяных плошчах. Тэмпература глебы значна панізілася.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Рэха падзеі

Тэлеверсію гала-канцэрта фестывалю армейскай песні «Звязда» ў Дзень Перамогі пакажа тэлеканал «Беларусь 3»

# СПРАВЫ ПАТРЫЁТАЎ, або Якая армія без песні?

**Ужо дванцаты раз запар вайскоўцы і сяржанты тэрміновай службы, курсанты і сувораўцы, прапаршчыкі і афіцэры, члены іх сем'яў, а таксама моладзь і дзеці з усёй краіны збіраюцца падчас тэлевізійнага фестывалю армейскай песні «Звязда». За час існавання фестывалю праз яго прайшло больш як 16 тысяч выканаўцаў — з году ў год, быццам зоркі на небе, адкрываюцца новыя таленты.**




Фота Ірыны МАЛІНОЎСКАЙ.

Пераходны прыз міністра абароны сёлета атрымаў калектыў Ваеннай акадэміі.

— Фестываль — гэта не толькі стварэнне добрага настрою ў гарнізонах, дзе праходзяць службу вайскоўцы і пражываюць іх сем'і, гэта напаўненне жыцця духоўнасцю, прыгажосцю, творчасцю, — адзначыў падчас цырымоніі ўзнагароджання лаўрэатаў **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёр Аляксандр ГУРА.** — Фестываль дазваляе праявіць, развіваць і ўдасканальваць талент, садзейнічае фарміраванню патрыятызму, які з'яўляецца фундаментам моцы грамадства, народа, дзяржавы.

Па выніках адборачных этапаў лаўрэатаў вызначылі ў чатырох намінацыях. Пераможцы, а таксама найбольш яркія ўдзельнікі конкурсу выступілі падчас гала-канцэрта. Пакуль артысты хваляваліся за кулісамі, з некаторымі з іх удалося пазнаёміцца.

Вакальна-інструментальны ансамбль «Звязда», які аднайменны не толькі фестывалю, а і нашай газеце, прадстаўляе вайсковую часць нумар 89417. Каб не ваенная форма, нізавошта не здагадалася б, што гэтыя хлопцы ў сваім звычайным жыцці выконваюць рэальныя баявыя задачы. Таленавітыя і харызматычныя, яны, хутчэй, нагадваюць прафесійных музыкаў, а між іншым, ні ў аднаго з іх няма музычнай адукацыі. Толькі гэта не перашкаджае вайскоўцам узнімаць настрой сваім аднапалчанам, а цяпер і масаваму гледачу.

Самыя юныя лаўрэаты фестывалю — малодшая група вакальнай студыі «ДоМіСолькі» з Чашнікаў — былі на сёмым небе ад шчасця, калі даведаліся, што выступяць падчас гала-канцэрта. Нягледзячы на не па гадах багаты творчы шлях, армейская тэматыка ў рэпертуары шасці дзяўчынак і аднаго хлопчыка, якога яны жартам называюць разынкай нумара, упершыню. І ўсё ж такім вобразе ім больш чым камфортна.

— Мы ацэньвалі не толькі выканаўчыя здольнасці канкурсантаў, а і тое, наколькі чалавек валодае акцёрскім майстэрствам, ці разумее ён тое, пра што спявае, — расказвае **член журы, кіраўнік Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл палкоўнік Уладзімір ВАРАПАЕЎ.** — Канкурсанты настолькі самабытныя, што некаторых з іх я з задавальненнем запрасіў бы да сябе ў калектыў. Думаю, што менавіта так і будзе. І такія прыклады ўжо ёсць. Валерый Грэсік, які летась заняў першае месца ў намінацыі «Аўтары-выканаўцы», цяпер праходзіць службу па кантракце ў ансамблі. Адзін з яркіх выканаўцаў калектыву, Яўген Гушча, таксама ў свой час быў заўважаны падчас фестывалю. Яго лаўрэаты сёння працуюць і ў іншых калектывах, займаючы вядучае месца ў творчасці нашай краіны.

**Начальнік вядучай ваеннай ВНУ краіны генерал-маёр Віктар ЛІСОЎСКІ** лічыць, што той, хто валодае творчым патэнцыялам, добра рыхтуецца і сур'ёзна адносіцца да гэтага віду мастацтва, у праве разлічваць на поспех. «Людзі, якія валодаюць творчым патэнцыялам, сапраўды здольныя пастаяць за сябе, сваю сям'ю, а значыць за беларускі народ і сваю краіну», — кажа начальнік Ваеннай акадэміі.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

# ЧАТЫРЫ ТЭСТЫ І ТРЫ РЭЗЕРВОВЫЯ ДНІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Вядома, многія хацелі б праверыць сябе ў «баявых» умовах, але ўдзел у ЦТ людзей, якія не плануюць паступленне ў бягучым годзе, істотна ўплывае на нашу работу, — тлумачыць **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — Для таго каб паспець у вельмі сціслыя тэрміны праверыць усе тэставыя работы і выдаць удзельнікам сертыфікаты ЦТ да пачатку прыёму дакументаў у ВНУ, нашы работнікі вымушаны працаваць у тры змены. Да таго ж удзел дзесяцікласнікаў у ЦТ скажае статыстыку вынікаў, што таксама непажадана...

## ПАШПАРТ, А НЕ ПАСВЕДЧАННЕ КІРОЎЦЫ

У пункт рэгістрацыі на ЦТ абітурыент павінен прыйсці з пашпартам (непатрэмінаваным!) або іншым дакументам, што пацвярджае яго асобу (гэта можа быць пасведчанне на правы жыхарства, пасведчанне бежанца ці афіцыйная даведка, якая выдаецца органамі ўнутраных спраў у выпадку страты ці крадзяжу дакумента, што пацвярджае асобу). Ніякія іншыя дакументы, у тым ліку пасведчанне кіроўцы, для рэгістрацыі не падыходзяць.

Выбар мовы, на якой абітурыент жадае здаваць тэсты, ажыццяўляецца менавіта на этапе падачы заявы і рэгістрацыі на ЦТ. Заява запаўняецца ўдзельнікам ЦТ на адной з дзвюх дзяржаўных моў: беларускай ці рускай на выбар. Трэба мець на ўвазе, што пазней на цэнтралізаваным тэсціраванні зона рэгістрацыі бланка адказаў будзе запаўняцца абітурыентам на той жа мове, на якой была пададзена заява пры рэгістрацыі. І сертыфікат удзельніка ЦТ будзе запаўняцца таксама на той мове, на якой падавалася заява.

Пасля падачы заявы абітурыент атрымлівае ў работніка пункта рэгістрацыі рахунак і ажыццяўляе аплату за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ. Гэта **сума складае 0,1 базавай велічыні (2 рублі 30 капеек) за адзін вучэбны прадмет.**

Унясенне сродкаў за афармленне і прыём дакументаў ажыццяўляюцца праз АРІП (сістэму адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы): гэта можна зрабіць у інфакіёсках, плацежных тэрміналах і банкаматах, тэрміналах Cash-In, разлікова-касавых цэнтрах банкаў, з выкарыстаннем інтэрнэт-банкінгу і мабільнага банкінгу (непасрэдна ў пункце рэгістрацыі на ЦТ). Абітурыентам цяпер не трэба падаваць у пункт рэгістрацыі дакумент, які пацвярджае факт аплаты, бо ўся інфармацыя аб праведзеных плацяжах акумулюецца ў сістэме АРІП, і ў электронным выглядзе яна даступная і ўстановам адукацыі, і Рэспубліканскаму інстытуту кантролю ведаў.

**Можна здаць цэнтралізаванае тэсціраванне па дзвюх дзяржаўных мовах, а пазней выбраць лепшы з двух сертыфікатаў, забяспечыўшы сабе хоць некалькі дадатковых балаў.**

Пасля заканчэння рэгістрацыі і пацвярджэння факта аплаты абітурыент атрымлівае ў пункце рэгістрацыі пропуск на ЦТ, прад'явіўшы дакумент, які сведчыць яго асобу. Трэба мець на ўвазе, што пропуск для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні лічыцца зарэгістраваным, калі на ім маецца пячатка ўстановы, вызначанай пунктам рэгістрацыі на ЦТ, подпіс упаўнаважанага прадстаўніка пункта рэгістрацыі і ўказаны рэгістрацыйны нумар.

Абітурыенты, з якіх не спаганяецца плата за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, пры падачы заявы павінны прадаставіць дакументы, якія пацвярджаюць іх правы на льготу.

**Замежныя грамадзяне і грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежных дзяржаў, могуць накіраваць у пункт рэгістрацыі копію дакумента, які сведчыць іх асобу, і заяву па пошце, а рэгістрацыйны ўзнос аплаціць пасля прыезду ў Беларусь, але не пазней, чым за адзін дзень да пачатку тэсціравання па вучэбным прадмеце.** Заяву можна спампаваць на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў (rikz.unibel.by). Арыгінал дакумента, які сведчыць асобу, у гэтым выпадку прад'яўляецца пры атрыманні пропуска для праходжання тэсціравання.

## АБСТАВІНЫ, ЯКІЯ НЕЛЬГА ПРАДБАЧЫЦЬ

Істотным плюсам новых Правілаў прыёму можна лічыць з'яўленне трох рэзервовых дзён для здачы ЦТ: сёлета гэта 6, 8 і 10 ліпеня. Раней быў прадугледжаны ўсяго адзін такі дзень, і калі абітурыент захварэў і прапусціў, напрыклад, два ЦТ, ён вымушаны быў страчваць цэлы год. Да таго ж спартсмены маглі прапусціць здачу ЦТ з-за важных спаборніцтваў, музыканты — з прычыны ўдзелу ў фестывалях і г. д. Цяпер у іх будзе магчымасць скарыстацца рэзервовымі днямі. Канкрэтнага пераліку ўважлівых прычын няма, кожны выпадак разглядаецца індывідуальна. Напрыклад, страта пашпарта лічыцца ўважлівай прычынай, але ўсё роўна трэба мець даведку, якая пацвярджае гэты факт.

Таксама тры рэзервовыя дні для праводзення ЦТ дадуць шанц паўдзельнічаць у конкурсе на бюджэтныя месцы абітурыентам з Расіі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана, якія не паспявалі прыехаць у Беларусь у чэрвені, каб здаць ЦТ разам з беларусамі, паколькі ў гэты ж час яны здавалі свае нацыянальныя экзамены. У іх была адзіная магчымасць стаць студэнтам беларускай ВНУ — праходзіць субяседаванне восенню і паступаць на платную форму навучання як замежным грамадзянам з адпаведнымі «расцэнкамі» за вучобу.

**Тэрміны рэгістрацыі абітурыентаў для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні — з 30 чэрвеня па 3 ліпеня.** Пункты рэгістрацыі — БДУ, Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт і Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога. Месцам правядзення вызначаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# Святло ідзе з Усходу

**Выдавецкі дом «Звязда» ўжо некалькі гадоў шмат сіл і намаганняў прыкладае для развіцця беларуска-кітайскіх культурных і літаратурных сувязяў. Адзін з адметных і яркіх праектаў — выданне серыі кніг «Светлыя знакі. Паэты Кітая». Тым, хто працаваў над выданнем кніг серыі, мы задалі адно пытанне: <u>што вас асабіста прыцягвае ў жаданні пазнаёміць чытача з кітайскай паэзіяй па-беларуску</u>?**

**Мікола МЯТЛІЦКІ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь:**

— Мне здаецца, я праходжу яшчэ адну школу творчага жыцця. Працуючы многія гады над пераўвасабленнем лепшых узораў кітайскай паэзіі на беларускую мову, я зрабіў для сябе нямала адкрыццяў. І пераканаўся, што Кітай — унікальная культурная, асветніцкая прастора, якую проста нельга не ўлічваць у жаданнях зазірнуць у заўтра.

**Юлія АЛЕЙЧАНКА, адказны сакратар часопіса «Полымя», паэт, перакладчык, літаратуразнаўца:**

— Мне даспадобы вершы і Мэн Хаажаня, і Ван Гачжэня, і другіх паэтаў, якія я пераклала для серыі «Светлыя знакі...». Дзякуй маёй памочніцы Дар'і Нечыпарук, якая рыхтуе падрадкоўнікі і фактычна выступае кансультантам многіх акалічнасцяў, што ўзнікаюць у рабоце над тэкстамі. Упэўнена, што ў нараджэнні такога творчага праекта ёсць пэўная заканамернасць. Яна ў тым, што з году ў год Кітай, Усход становіцца бліжэй да нас, да Еўропы. І чаму масты паразумення не трываліць менавіта праз мастацкую літаратуру, праз добрую і прыцягальную паэзію?!

**Каміль КАМАЛ, жывапісец, кніжны графік:**

— Для серыі «Светлыя знакі...» я аформіў ужо чатыры кнігі. Мне вельмі цікава чытаць кітайскую паэзію ў перакладзе на беларускую мову. Знаходжу там шмат сімвалаў, цікавых мастацкіх вобразаў. Асабліва здзіўляе мяне класіка. Кітайцы ўвогуле вялікія малайцы, што столькі стагоддзяў трымаюць у сваёй нацыянальнай памяці ранейшыя традыцыі вершаскладання, памятаюць паэтаў першага тысячагоддзя і нават тых, хто пісаў вершы яшчэ ў другім-трэцім стагоддзях да нашай эры. Такі «ўзрост» памяці не можа не захапляць!..

**Дар'я НЕЧЫПАРУК, выкладчык кафедры кітайскай філалогіі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта:**

— Да перакладаў вершаў для серыі «Светлыя знакі...» заахвочваю студэнтаў, аспірантаў, якія ведаюць, вывучаюць кітайскую мову. Такім чынам, творчы, выдавецкі кніжны праект носіць і адукацыйны характар, што па сённяшнім часе ўсталявання, пашырэння кантактаў Беларусі і Кітайскай Народнай Рэспублікі вельмі важна.

**Гутарыў Сяргей ШЫЧКО.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62.

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот №1. Право заключения договора аренды на 5 лет земельного участка, кадастровый №240155400001000375 площадь 0,0045 га, адрес: Витебская обл., Витебский р-н, г. п. Руба, ул. Центральная возле дома №1 под строительство объекта «Павильон с торговым залом в городском поселке Руба, по улице Центральной возле дома №1», без создания капитального строения (размещение объектов розничной торговли). **Нач. цена**: 197,48 руб. **Задаток:** 19,75 руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 05.06.2017 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 03.05.2017 с 8.30 по 02.06.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3642302000280 в ф-ле №200 Витебское обл. управление ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 635, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. **Условия аукциона:** заключить договор аренды зем. участка с Витебским горисполкомом; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательных работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 (три) месяца; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД |

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот №1. Право заключения договора аренды на 10 лет земельного участка, кадастровый №224685690601000390 площадь 0,0866 га, адрес: Витебская обл., Толочинский р-н, Кохановский с/с, г. п. Коханово, ул. Старосельская для установки и обслуживания торгового павильона. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона водного объекта (пруд), охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 В. **Нач. цена**: 2 622,51 руб. **Задаток:** 262,20 руб. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 23.05.2017 в 10.00 по адресу: г. Толочин, ул. Ленина, 1 в Толочинском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 03.05.2017 с 8.30 по 22.05.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600327009571 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04002. Получатель платежа: ГУ МФ по Витебской области. **Условия аукциона:** не позднее 2 рабочих дней после внесения денежных выплат заключить с Толочинским райисполкомом договор аренды зем. участка; по окончании срока аренды зем. участка совместно с местным исполкомом решить вопрос его дальнейшего использования; получить АПЗ и ТУ для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение на проведение проектно-изыскательных работ, разработку строительного проекта на установку торгового павильона в срок, не превышающий 2 лет; в ПСД предусмотреть компенсационные посадки взамен вырубаемых деревьев; приступить к установке торгового павильона в течение 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке ПСД на строительство; завершить установку торгового павильона в сроки, определенные ПСД |

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот №1. Право заключения договора аренды сроком на 10 лет земельного участка с кадастровым №240100000003009897 площадью 0,1537 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Чкалова для строительства объекта «Автомойка в Медцентре возле разворотного кольца в городе Витебске» (размещение объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в том числе автомобильных заправочных и газонаполнительных станций)). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 В, сетей и сооружений водоснабжения. **Нач. цена**: 8 185,30 руб. **Задаток:** 818,53 руб. |
| Лот №2. Право заключения договора аренды сроком на 3 года земельного участка с кадастровым №240100000002009271 площадью 0,0145 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Транспортная для строительства объекта «Модульная мастерская шиномонтажа по ул. Транспортная в г. Витебске». Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Нач. цена**: 437,35 руб. **Задаток:** 43,74 руб. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона**: 30.05.2017 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 03.05.2017 с 8.30 по 29.05.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30. в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3642302000280 в ф-ле №200 Витебское обл. управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. **Условия аукциона:** заключить с Витебским горисполкомом договор аренды зем. участка; получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца, с момента гос. регистрации права на зем. участок; при необходимости привлечь инженерную организацию (инженера) для оказания инженерных услуг в строительстве в порядке и на условиях, предусмотренных законодательством и договором на оказание инженерных услуг |

Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона в установленном порядке обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221285905601000077, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Койтово, ул. Центральная, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина). Нач. цена: 2 000 руб. Задаток: 200 руб. Реквизиты для внесения задатка: р/с 3600314090173 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Мазоловский сельисполком) |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221284810101000093, площадью 0,1422 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Новоселки, участок 2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина, оз. Белое). Нач. цена: 4 000 руб. Задаток: 400 руб. Реквизиты для внесения задатка: р/с 3600314080109 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Летчанский сельисполком) |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 19.05.2017 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 03.05.2017 с 8.30 по 18.05.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни |

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона (утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся); получить в отделе архитектуры и строительства Витебского райисполкома техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; приступить к занятию земельного участка не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения) (одноквартирного жилого дома); осуществить строительство в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно проектно-сметной документации. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

3 мая 2017 г.
№ 15 (399)

ГАЛОЎНАЯ ТЭМА

# КАМУ БУДЫНАК НЯДОРАГА?

## Як мясцовыя ўлады шукаюць новых гаспадароў для маёмасці, якая не выкарыстоўваецца



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**У мінулую пятніцу Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі правёў чарговае выязное пасяджэнне. На прыкладзе Мінскага і Дзяржынскага раёнаў члены Савета абмеркавалі ўвядзенне ў гаспадарчы абарот камунальнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца ці выкарыстоўваецца неэфектыўна. Адзінага рэцэпта, дарэчы, тут няма, а вось пытанняў у дэпутатаў усіх узроўняў накапілася даволі шмат.**

### ПА ПРЫКЛАД — У РАЁН

Зранку члены Савета на чале са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намеснікам старшыні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Аляксандрам Папковым накіраваліся ў Заслаўе. Там размешчана прадпрыемства аднаго з вядомых беларускіх вытворцаў тэкстылю «Марк Фармэль». Кампанія даволі маладая — яшчэ няма і дзесяці гадоў, але ўжо заваявала сэрцы пакупнікоў якасцю і дызайнам сваёй прадукцыі. Але ўвагу членаў Савета яна прыцягнула не толькі з гэтай прычыны: вытворчасць размясцілі там, дзе раней была карданажная фабрыка. Тым самым выратавалі стратнае прадпрыемства, ды яшчэ як! Захавалі выраб кардону як адзін з кірункаў работы: летась яго вырабілі на суму ў 705 000 рублёў. У той дзень члены Савета па ўзаемадзеянні таксама наведалі Фаніпальскі завод вымяральных прыбораў «Энергамера», створаны на базе недабудаванага гандлёвага цэнтра, холдынг «САЛЕО» і прадпрыемства «Элезер» у Дзяржынскім раёне.

3 стар.

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч — пра...**

## «Асноўная праблема — гэта недасканалае заканадаўства»

***...заканадаўства***

Асноўная праблема пры нашай сіле кантрольна-наглядных структур — гэта недасканалае заканадаўства. І недасканаласць заключаецца ў некарэктных фармулёўках: агульных, адсылачных. А гэта дазваляе кожнаму разумець і трактаваць іх пасвойму.

***...працу***

Дзяржава павінна як укладваць у эканоміку ўласныя сродкі, так і рабіць камфортныя ўмовы для прыватных інвестараў. Такім чынам стварацы новыя крыніцы даходу і новыя працоўныя месцы. У мінулым годзе было звольнена на 107 000 чалавек больш, чым прынята на працу. За тры месяцы гэтага года мы таксама маем каля 10 000 сальда: звольненых больш, чым прынятых. Гэта стварае ланцужок дрэнных наступстваў.



***...інвестыцыі***

Без інвестыцый немагчыма павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі, тым больш, што цяпер на гарызонце маячыць пагроза яе зніжэння. Чаму? Першае — сітуацыя з інвестыцыямі знаходзіцца ў крытычнай зоне эканамічнай бяспекі. У 2015 годзе доля інвестыцый у асноўны капітал апусцілася на 17,5% і стала ніжэйшая за парогавы ўзровень, які вызначаны як 25%. У 2016 годзе — яшчэ мінус 18%, гэта значыць, калі ў 2011 годзе інвестыцыі ў асноўны капітал складалі 33,2% да ВУП, то ў 2016 — 19%. Няма перспектыў і на 2017 год, пад пагрозай 2018-ы. Ужо зараз відавочна, што не будзе належнай колькасці праектна-каштарыснай дакументацыі пад інвестплан 2018 года, нават калі будуць грошы. Пакольки на экспертызу ў 2016 годзе было заяўлена праектаў на 20% ніжэй, чым у 2015.

***...дзяржмаёмасць***

Створаныя магутнасці павінны прыносіць прыбытак і забяспечваць занятасць насельніцтва. Таму пытанне ўліку, захаванасці, эфектыўнага выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці дзяржавы, і распараджэння ёю надзвычай важнае. Гэта актуальнае пытанне павінна разглядацца ў комплексе з інвестыцыямі як адзінае цэлае, якое забяспечвае нарошчванне вытворчага і эканамічнага патэнцыялу краіны.

***...адказнасць***

Што дзяржава атрымлівае ад таго, што яна валодае такім велізарным маёмасным актывам? Даходнасць дзяржуласнасці цяпер проста недапушчальна нізкая. У 2016 годзе на дзяржаўны пакет акцый па ўсёй дзяржаўнай уласнасці ў бюджэт прыйшло ўсяго толькі 3,3%. І пры гэтым асноўныя сродкі паступілі ад Беларуськалія і МТЗ, таму дзяржава мае права пытацца, якую ж выгаду ў параўнанні, дапусцім, з недзяржаўным сектарам мае ўласнік. У гэтым плане адказнасць за эканамічныя вынікі размытая. Адказвае хто? Дзяржкаммаёмасць, галіновае міністэрства, выканкам і прадпрыемства. У выніку атрымліваецца калектыўная безадказнасць.

***...вёскі***

Я мяркую, што трэба даць магчымасць новым уласнікам будавацца на старых «агародах». Гаворка ідзе пра неперспектыўныя вёскі. Трэба таксама матываваць спадчыннікаў на продаж дамоў і сядзіб, якія фактычна зрабіліся непрыдатнымі. Нешта, відома, прыйдзецца ўтылізаваць. Не без гэтага. Але галоўная мэта — адрадзіць гэтыя калісьці зручныя для жыцця паселішчы. Трэба імкнуцца аддаць гэтыя вёсачкі новым гаспадарам, не выганяць людзей з абжытых месцаў. Асабліва каля буйных гарадоў людзі маюць патрэбу дзесьці арганізаваць свой адпачынак, а можа, і побыт. Людзі, якія прыйдуць туды, дапамогуць жыць пакінутым там суседзям.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Зарэгістраваць прадпрыемства будзе прасцей

## *Адбылося пасяджэнне сесіі верхняй палаты беларускага парламента*

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу шостага склікання на чарговым пасяджэнні другой сесіі прыняў да ведама Дэкрэт № 2 ад 27 лютага 2017 года, які ўносіць змяненні ў парадак дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання. Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі, назваў дакумент як ніколі актуальным.**

«У Пасланні Прэзідэнт таксама ўдзяліў шмат увагі лібералізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, работы з інвестарамі, справаздачнасці», — адзначыў ён. Менавіта з гэтымі сферамі напрамую звязаны дэкрэт. На думку спікера верхняй палаты беларускага парламента, кантрольныя органы як мінімум не павінны перашкаджаць развіццю бізнесу і прыходу інвестараў.

**Міністр юстыцыі Беларусі Алег СЛІЖЭЎСКІ** лічыць, што парадак дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання ў Беларусі з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў дзяржаўнага рэгулявання. У мэтах скарачэння адміністрацыйных працэдур і паскарэння пачатку ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці дэкрэтам прадугледжана магчымасць адкрыцця банкаўскага разліковага рахунку адначасова з рэгістрацыяй суб'екта гаспадарання на падставе прадстаўлення рэгіструючага органа. Шэраг мер прапісаны дакументам і для паляпшэння інвестыцыйнага клімату.

# Згадаць пра галоўнае

## *Сенатар узяў удзел у мітынгу ў памяць аб аварыі на ЧАЭС*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў прыняў удзел у мітынгу-рэквіеме ў памяць аб чарнобыльскай трагедыі.**




Традыцыйна мітынг адбыўся ў Магілёве. У мерапрыемстве таксама ўзялі ўдзел дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, кіраўнікі Магілёўскага абласнога і гарадскога выканаўчых камітэтаў, прадстаўнікі працоўных калектываў, моладзі і навучэнцаў.

# Бар'еры, выняткі, абмежаванні

## *Праблемныя пытанні інтэграцыйных аб'яднанняў абмеркавалі ў Савеце Рэспублікі*

**У верхняй палаце беларускага парламента адбылося пасяджэнне секцыі навукова-кансультацыйнага савета па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі.**

Падчас яго гутарка ішла аб праблемах развіцця інтэграцыйных працэсаў у межах Еўразійскага эканамічнага саюза і Саюзнай дзяржавы і шляхах іх вырашэння. У рабоце секцыі ўдзел узялі прадстаўнікі дзяржаўных органаў — міністэрстваў замежных спраў, юстыцыі, аховы здароўя, эканомікі, — а таксама бізнес-асяроддзя. Мерапрыемства наведалі кіраўнікі буйных кампаній, такіх як, напрыклад, «Палессе» — аднаго з лідараў па вытворчасці цацак для дзяцей на постсавецкай прасторы.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

100 ІДЭЙ

# АД ДАСЛЕДЧЫКА — ДА НАВУКОЎЦА-ПРАФЕСІЯНАЛА

**Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ лічыць, што ўдзельнікаў праекта БРСМ «100 ідэй для Беларусі» трэба матываваць да паступлення ў аспірантуру. Такую думку ён агучыў падчас «Адкрытага дыялогу» на тэму «Навука будучыні — навука маладых». «Адкрыты дыялог» стаў цэнтральным мерапрыемствам фіналу рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» і сабраў больш як 400 маладых і масцітых навукоўцаў.**



Міхаіл Мясніковіч выказаў занепакоенасць тым, што моладзь не хоча ісці ў аспірантуру, асабліва гарадская, адсюль і нізкія конкурсы... Трэба думаць, як выправіць гэту сітуацыю, як не толькі выяўляць самародкаў з прыроднымі задаткамі даследчыка, але і стымуляваць іх, як дапамагчы ім вырасці ў прафесійных навукоўцаў.

Старшыня Савета Рэспублікі канстатаваў, што праект прыцягвае маладых вынаходнікаў і рацыяналізатараў з усіх рэгіёнаў. У 2016 годзе ў адрас арганізатараў паступіла больш як 2 тысячы заявак.

«Усе праекты, прадстаўленыя ў фінале, прайшлі сур'ёзную навуковую экспертызу, гэта арыгінальныя ідэі. Выдатна, што фінал конкурсу праходзіць у Год навукі ў сценах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, бо гэта магутны навукова-вытворчы кластар, які фантануе новымі ідэямі і ўкараняе іх у эканоміку краіны. Не сумняваюся, што ў пераможцаў «100 ідэй для Беларусі» — зайздросныя перспектывы...», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

Падчас «Адкрытага дыялогу» старшыня Савета Рэспублікі выказаў шэраг прапаноў па ўдасканаленні арганізацыі конкурсу і адказаў на пытанні ўдзельнікаў.

Нагадаўшы аб нядаўняй сустрэчы Прэзідэнта з навукоўцамі, Міхаіл Мясніковіч заклікаў маладых навукоўцаў накіроўваць у Акадэмію навук прапановы па ўдасканаленні арганізацыі навуковай дзейнасці, паколькі гутарку пра перспектывы беларускай навукі плануецца працягнуць у верасні.

Ідэйным натхняльнікам конкурсу «100 ідэй для Беларусі» выступае грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Праект рэалізуецца пры падтрымцы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, міністэрстваў адукацыі і эканомікі, НАН Беларусі, Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях, Асацыяцыі абароны інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд» і Нацыянальнага прэс-цэнтра.

На інтэрактыўнай выстаўцы найлепшых інавацыйных праектаў і навукова-тэхнічных распрацовак конкурсу «100 ідэй для Беларусі» было прадстаўлена каля 120 праектаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** nikalaeva@zviazda.by

АКЦЫЯ

# «ЗДАРОЎЕ ЖАНЧЫНЫ — ЗДАРОЎЕ НАЦЫІ»



Фота Алесі СІДАРЭНКІ.

**У рамках рэспубліканскай акцыі пад такой назвай Краснапольскі раён наведала дэлегацыя на чале з намеснікам старшыні грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» Надзеяй ЕРМАКОВАЙ.**

Візіт быў прымеркаваны да 31-й гадавіны са дня чарнобыльскай трагедыі. Разам з рэспубліканскімі і абласнымі актывістамі гэтага руху ў раён прыехалі 2 анколагі-мамолагі, эндакрынолаг і оталарынголаг. Яны агледзелі каля 150 чалавек. «Для жыхароў Краснапольшчыны вельмі важна, што пра іх не забываюць, клапоцяцца пра іх здароўе, — адзначыла галоўны ўрач Краснапольскай цэнтральнай раённай бальніцы Галіна Марозава. — Асабліва запатрабаваныя былі кансультацыі мамолагаў. У раённых бальніцах такіх спецыялістаў наогул няма».

Акцыю таксама падтрымалі дэпутаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяна Кананчук і член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Вольга Петрашова. Разам са старшынёй Краснапольскага райвыканкама Ігарам Балахонавым і старшынёй Краснапольскага райсавета дэпутатаў Анжалікай Гоман госці прынялі ўдзел у мітынгу-рэквіеме, прымеркаваным да гадавіны аварыі на ЧАЭС і ўсклалі кветкі да паднsocжжа помніка адселеным вёскам. У гэты ж дзень яны пабывалі ў Краснапольскім раённым цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, якому Надзея Ермакова перадала ў якасці падарунка музычны цэнтр, наведалі з падарункамі дзіцячыя дамы сямейнага тыпу Алены і Дзмітрыя Алепкаў, Алены і Ігара Хлыстовых, а потым сустрэліся з найлепшымі прадстаўнікамі тутэйшай моладзі ў раённым цэнтры культуры і вольнага часу «Міраж». Падчас круглага стала ў моладзі была магчымасць расказаць пра сябе і задаць пытанні. А пераможцам прадметнай алімпіяды і спартыўных спаборніцтваў былі ўручаны ўзнагароды і памятныя падарункі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

# КАМУ БУДЫНАК НЯДОРАГА?



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

У выніку можна сказаць адно: гісторыі поспеху з пакупкай маёмасці, якая выкарыстоўвалася неэфектыўна, сапраўды існуюць. Пры якасных разліках, прыцягненні інвестыцый і добрым менеджменце зрабіць на месцы стратнай вытворчасці эканамічна перспектыўную фабрыку ці завод магчыма. Але знайсці пакупнікоў, у якіх ёсць усе гэтыя тры інгрэдыенты поспеху, даволі цяжка. Да таго ж, на практыцы існуюць пэўныя бар'еры, якія часам не даюць развівацца сельвыканкамам з баластам у выглядзе маёмасці, якая ўжо нікому не патрэбна.

## КАТЭДЖ ЗАМЕСТ ЛАГЕРА

Насамрэч, пакуль пытанняў з продажам дзяржаўнай уласнасці, якая не выкарыстоўваецца, больш, чым адказаў. І гэта датычыцца амаль кожнай яе катэгорыі. Напрыклад, дзіцячыя лагеры. У свой час многія прадпрыемствы для дзяцей сваіх супрацоўнікаў будавалі такія месцы адпачынку. Гэта было папулярна і зручна, асабліва калі яны знаходзіліся непадалёку ад горада. Але разам з тым, калі заводы бяднелі, прыходзілі ў непрыдатнасць і гэтыя забудовы. Зараз сітуацыя амаль жахлівая. Скажам, у Мінскім раёне з 70 лагераў 44 не выкарыстоўваюцца ці выкарыстоўваюцца неэфектыўна.

Будынкі знаходзяцца ў лясным масіве, і некаторыя з іх былі прададзены ў прыватныя рукі. Але работа не ідзе. Чаму? Пакупнікі акуратна плацяць падаткі, але нічога не робяць на зямлі, таму што чакаюць указа Прэзідэнта, згодна з якім можна было б змяніць мэтавае прызначэнне зямлі. Тады будзе магчыма замест аздараўленчых лагераў пабудаваць катэджы, якія, вядома, можна прадаць за большую цану. Месца побач са сталіцай, ды яшчэ і ў лесе, цэніцца заўжды... Ведаючы сітуацыю, Мінскі абласны выканаўчы камітэт не так даўно вырашыў: такія пакупнікі, якія нічога не робяць на месцах, павінны плаціць падаткі на зямлю і на нерухомасць у дзесяцікратным памеры. Пасля гэтага работа пайшла хутчэй. З тымі ж, хто і цяпер ігнаруе стымулы да будаўніцтва, будуць размаўляць асобна. І калі райвыканкам не зможа знайсці кансэнсус з прыватнікамі на працягу гэтага года, магчыма, будуць шукаць шляхі, як знесці закінутыя забудовы і перадаць зямлю лясніцтву.

## СВОЕЧАСОВАЯ ДАПАМОГА

Па словах старшыні Мінскага райвыканкама Пятра Ярмаша, самі ўлады трапляюць у сітуацыі, калі існуючыя правілы ствараюць перашкоды для эканамічнага развіцця і ўвядзення ў абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Напрыклад, памяшканні, што знаходзяцца пад арыштам. Калі суд прымае такое рашэнне па прадпрыемстве-даўжніку, апошні за аб'ект не плаціць падаткі, ды і прадаць будынак хутка, часцей за ўсё, не атрымліваецца. Іншы выпадак, калі аб'ект кансервуецца. Гэта рашэнне прымаецца ўласнікам без выканкама. За такія памяшканні зноў жа падаткі не плацяць. Адзінае — глядзяць, каб там усё не зарастала пустазеллем.

З боку ўлады, вядома ж, было б выгадна, калі б падаткі на такія памяшканні захоўваліся ці рашэнні прымаліся б разам з выканкамамі. Але гэты падыход да прыватнай уласнасці падаецца не зусім карэктным, таму сітуацыя застаецца такой, як сёння. Іншая справа, што хутчэй за ўсё мясцовыя ўлады ведаюць гаспадароў прадпрыемстваў на сваёй тэрыторыі, сочаць за іх актыўнасцю і самі зацікаўлены ў іх працвітанні, таму разумеюць, што трэба працаваць на апярэджанне. Выканкамы разам з кіраўнікамі вытворчасцяў могуць шукаць выйсце з цяжкіх сітуацый, калі вытворчасць рызыкуе стаць стратнай, — гэткая ўзаемадапамога. Толькі такім чынам абодва бакі застануцца ў плюсе.

## ЦІ МЭТАЗГОДНА?

Найбольш вострыя пытанні наконт маёмасці агучыў старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра. Яны характэрныя для ўсіх абласцей. Што датычыцца аварыйных дамоў, сёлета ў Мінскай вобласці плануюць знесці каля 1300 такіх будынкаў. Але гэта можна зрабіць толькі пасля трох гадоў, як яны пустуюць без гаспадара. За гэты час выканкам правярае, каб ніхто там не жыў, шукае спадчыннікаў. Афармленне дакументаў і ўсе працэдуры — гэта выдаткі для бюджэту. Але ніхто не застрахаваны ад таго, што нават потым не з'явіцца сваяк, які праз суд можа запрасіць яшчэ, як той казаў, круглую суму за страчаны дом... Неабходна, каб працэдура перадачы маёмасці ва ўласнасць сельсавета была спрошчана, але ці не павялічыць гэта колькасць судовых спраў?

Другая праблема — продаж «аб'ектаў пад знос» не прадугледжвае льгот для пакупніка на гэту працэдуру. Часам разбурыць прадпрыемства даражэй, чым купіць зямлю, таму і ахвотнікаў на аўкцыёнах на такія будынкі няма. Як прапанова — прадаставіць пакупнікам ільготы ў выглядзе зніжаных падаткаў на суму зноса. Такая прэферэнцыя была б выгадна і пакупніку, і дзяржаве, якая нарэшце вызваліцца ад непатрэбных будынкаў. Да таго ж сама працэдура зносу даволі складаная. Для гэтага трэба мець праектна-каштарысную дакументацыю, а значыць вялікія выдаткі і грошай, і часу. Прычым не зусім зразумела, ці настолькі неабходны праект будынка, які плануюць знесці, каб з ім столькі марудзіцца? Ці мэтазгодна гэта?

Да таго ж для юрыдычных асоб падрыхтоўка пакета дакументаў абыдзецца даражэй, чым для фізічных. Выканкамы просяць знізіць цану на такія паслугі і зменшыць колькасць дакументацыі, якую неабходна афармляць перад перадачай уласніку. Абмежавацца можна тымі паперкамі, якія павінен зрабіць сам пакупнік, калі ўжо будзе мець на руках аб'ект.

Яшчэ адна праблема, характэрная для Любанскага і Дзяржынскага раёнаў, — былыя ваенныя гарадкі.

> Адзін з асноўных недахопаў у сістэме заключаецца ў тым, што за дзяржаўную маёмасць нясуць адказнасць усе, у тым ліку і кантрольна-наглядныя органы. Гэта часам перашкаджае рабоце Саветаў.

Усяго ў Мінскай вобласці іх было каля 300. Цяпер уцягнута ў абарот — 165, законсервавана — 27, знесці — 62, засталося — 46. Там у пакупнікоў існуюць праблемы з інжынернымі сеткамі, якія «звязваюць» участкі, і, калі ўласнікі розныя, ім цяжка вырашыць гэта пытанне. Па прапанове раздзел інжынерных сетак трэба рабіць яшчэ пры продажы, каб



не ствараць дадатковых цяжкасцяў для пакупнікоў.

## НАПРАМКІ РУХУ

Гэтыя і іншыя праблемы знайшлі водгук сярод кіраўнікоў абласцей Беларусі. Але як іх вырашаць, пакуль да канца не вядома. Адказ на гэта чакалі ад Камітэта дзяржаўнай маёмасці, але ў межах існуючай сістэмы задаволіць усе патрэбы адразу немагчыма.

Па шчырасці, не ўсе кіраўнікі райвыканкамаў і ўласнікі дасканала ведаюць нюансы продажу такіх аб'ектаў, таму што механізм не празрысты і не вельмі зразумелы. Падчас продажу ўзнікае шмат пытанняў. Напрыклад, калі будынак прадаецца за адну базавую велічыню, аб'ект падаткаабкладання таксама будзе ацэньвацца як адна базавая ці трэба браць за аснову рэальны кошт прадпрыемства?.. Калі з усім гэтым разабрацца, то будзе прасцей абодвум бакам. Бо пакуль многія не звязваюцца з гэтымі працэдурамі, каб не марнаваць час і сродкі. Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч даручыў разабрацца ў гэтым пытанні і папрасіў намесніка міністра фінансаў Дзмітрыя Кійко падрыхтаваць адпаведную інструкцыю, якая паствіць усе кропкі над «і» і зробіць працэдуру продажу зразумелай.

Дзяржаўнаму камітэту па маёмасці даручана ў месячны тэрмін «пакласці» ўсе агучаныя праблемы на паперу ў выглядзе праектаў нарматыўна-прававых актаў. Стала зразумела, што адзін з асноўных недахопаў у сістэме заключаецца ў тым, што за дзяржаўную маёмасць нясуць адказнасць усе, у тым ліку і кантрольна-наглядныя органы. Гэта часам перашкаджае рабоце Саветаў. Таму на пасяджэнні было прапанавана істотна пашырыць паўнамоцтвы Саветаў дэпутатаў і выканкамаў, каб іх рашэнні былі канчатковымі.

Пакуль застаецца ўражанне, што пытанняў з дзяржмаёмасцю, якая неэфектыўна выкарыстоўваецца, амаль столькі ж, колькі адпаведных аб'ектаў у краіне. У спрашчэнні працэдуры ўвядзення яе ў гаспадарчы абарот перш за ўсё зацікаўлена сама дзяржава. Лагічным выглядаюць прапановы па аблягчэнні механізмаў продажу ці перадачы маёмасці. Але пакуль сістэма застаецца заблытанай. У Саветаў дэпутатаў накапілася да яе столькі пытанняў, што зразумела: яна не адпавядае сучаснай сітуацыі і яе трэба сур'ёзна ўдасканальваць.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намеснік старшыні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Аляксандр ПАПКОЎ:**



— Абмеркаванне пытання аб уввядзенні ў абарот камунальнай формы ўласнасці, якая не выкарыстоўваецца многія гады, я лічу эканамічна актуальным. Уявіце сабе, што тысячы былых прадпрыемстваў мелі нейкую ўласнасць, якая сёння пустуе. Гэта, перш за ўсё, працоўныя месцы, гэта эканоміка раёнаў. Мы сёння запрасілі ўсіх зацікаўленых асоб, у першую чаргу кіраўнікоў адпаведных міністэрстваў, і разам шукалі падыходы, як правесці арганізацыйныя меры, якія прыняць адпаведныя нарматыўныя дакументы, каб уключыць гэтую ўласнасць у абарот. Гэта мае вельмі сур'ёзнае значэнне. Мы пераканаліся, што пытанняў, на жаль, вельмі шмат. Патрабуецца каардынацыя на ўзроўні цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання, разам з аблвыканкамамі, абласнымі Саветамі. Напэўна, трэба прымаць дапаўненні, змяненні ў існуючую нарматыўную базу, якія дадуць магчымасць у найбліжэйшы час выпрацаваць адпаведную сістэму падыходаў па вырашэнні праблем, якія мы абмяркоўвалі.

Нам неабходна сёння бачыць, распрацоўваць матрыцу развіцця рэгіёна з пункту гледжання эканомікі. Перш за ўсё, гэта эканамічны стан рэгіёна, сацыяльная абароненасць, працоўныя месцы, дэмаграфія, заработная плата і, вядома, глыбіня выкарыстання вытворчых магутнасцяў. Над гэтым трэба падумаць, і тады стане ясна, як працуе сёння Мінскі раён, як — Хоцімскі. Але ў той жа час нам трэба думаць аб адпаведных крытэрыях. Мы павінны браць пад увагу розныя фактары, не ўраўноўваць, а адпаведным чынам падымаць узровень. Мы не можам сёння параўнаць працу старшынь Крупскага і Мінскага райвыканкамаў. З улікам гэтага мы павінны прадумваць нашы падыходы ў будучыні. Трэба адыходзіць ад накатаных падыходаў і бачыць эканоміку, глыбіню самога працэсу. Як павышаць патрабавальнасць, калі мы не распрацавалі матрыцу, па якой павінны ацэньваць працу адпаведнага кіраўніка?

**Першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Аляксей ВАСІЛЬЕЎ:**



— Эканамічную аснову мясцовага кіравання складае камунальная ўласнасць, парадак кіравання і распараджэння вызначаецца адпаведнымі Саветамі дэпутатаў. У Мінскай вобласці рашэннем абласнога Савета дэпутатаў ад 2012 г. № 178 такі парадак вызначаны. І ў іншых абласцях існуюць падобныя рашэнні і аднолькавыя інструменты. Разам з тым спосабы выкарыстання гэтых інструментаў адрозніваюцца. Напрыклад, калі ў Мінскай вобласці аб'ект можна па рашэнні Савета дэпутатаў прадаць напрамую, то ў Магілёўскай вобласці, Бабруйскім раёне і горадзе Магілёве тое ж самае можна зрабіць толькі па рашэнні Кіраўніка дзяржавы. Як мы бачым, прымяняюцца розныя падыходы да выкарыстання такога інструмента, як прамы продаж. Маё меркаванне, калі саветы дэпутатаў хочуць быць больш самастойнымі, трэба ўсё ж такі смялей браць на сябе адказнасці і не перакладаць вырашэнне пытання на Кіраўніка дзяржавы.

У Мінскай вобласці 244 000 $м^2$ або 1,8% нявыкарыстанай маёмасці. Гэта даныя 2017 года. ФАПы, школы, дзіцячыя сады, клубы — сацыяльныя аб'екты. Гэта маёмасць не мае выяўленага камерцыйнага характару, як вынік цікавасць да яе праяўляюць пераважна мясцовыя дробныя прадпрыемствы, прадпрымальнікі, якія, як правіла, не валодаюць значнымі ўласнымі фінансавымі рэсурсамі. Любую маёмасць трэба разглядаць не столькі як маёмасную адзінку, а як патэнцыял для стварэння новай вытворчасці, новых працоўных месцаў, вызвалення ад няпрофільных аб'ектаў прадпрыемстваў ЖКГ, атрымання сродкаў у бюджэт ад продажу маёмасці або ад перадачы ў арэнду, задзейнічання людзей пры аптымізацыі вытворчасцяў, недапушчэння росту беспрацоўных, уключэння інвестыцый...

Што датычыцца спецыфічных аб'ектаў былых ваенных гарадкоў, то пытанне з імі стаіць досыць востра. Гэтыя аб'екты — не толькі велізарная казарма, якая знаходзіцца ўдалечыні ад населеных пунктаў і інфраструктуры, але і аб'екты, якія выкарыстоўваліся для захоўвання боепрыпасаў. Іх у асноўным замацоўваюць за прадпрыемствамі ЖКГ, што з'яўляецца для іх няпрофільнымі актывамі. Раней у рэспубліканскім бюджэце — у 2009 годзе — планаваліся сродкі на знос такіх аб'ектаў. На жаль, з 2010 года такое планаванне скончылася, і рэгіёны сутыкнуліся з сур'ёзнай праблемай. Такую маёмасць не закапаеш, і яе не так проста ўтылізаваць. Знос такой маёмасці дастаткова затратны. Мяркую, што неабходна вярнуцца да пытання выдзялення сродкаў для гэтых мэтаў або знішчаць такія аб'екты за кошт дапамогі ваенных. Акрамя таго, мяркую, што патрэбен спрошчаны парадак працы па зносе і ўтылізацыі аб'ектаў, якія не прыдатныя для выкарыстання.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

ФАКТАРЫ ПОСПЕХУ

# САКРЭТ — У ДРОБЯЗЯХ

## Якператварыць стратнае прадпрыемства ў прыбытковае?

**Універсальнага рэцэпта няма, але відавочна, што пры добрым менеджменце і інвестыцыях вярнуць да працы магчыма амаль любую вытворчасць. Так адбылося і з карданажнай фабрыкай у Заслаўі. Яна пачала страчваць свае абароты пасля развалу Савецкага Саюза, паступова стаўшы незапатрабаванай. Але перспектыву ў ёй убачыла кампанія «Марк Фармэль». Пасля выкупу яна захавала вытворчасць кардону, у тым ліку для ўласных патрэб, і стварыла на тым месцы панчошна-шкарпэткавую вытворчасць. За гэты час аб'ём кардоннай прадукцыі вырас амаль у тры разы, а брэнд «Марк Фармэль» стаў вядомым ужо далёка за межамі Беларусі. Сакрэты правільнага менеджменту нам раскрыў намеснік дырэктара па развіцці рознічнай гандлёвай сеткі Сяргей ЕГОРАЎ.**

Адно з важных пытанняў для кожнай новай кампаніі: дзе адкрыць вытворчасць? «Марк Фармэль», якая ўжо развілася ў буйнога вытворцу трыкатажу, пачынала ў 2009 з фабрыкі ва Уздзе і адной фірмовай крамы там жа. Калі выбіралі месца, глядзелі на прадпрыемствы, якія працуюць неэфектыўна і таму прадаюцца праз свабодныя таргі. «Мы ўбачылі, што можам развівацца на базе таго, што ўжо існуе ў Рэспубліцы Беларусь, і ў стане арганізаваць там вытворчасць запатрабаванай прадукцыі», — тлумачыць суразмоўца.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

> Як паказвае сусветная практыка, простае абнаўленне нейкага прадпрыемства, якое выпускае незапатрабаваную прадукцыю, не вырашае пытанне.

Пасля ўздзенскай фабрыкі было яшчэ некалькі такіх пакупак. Зараз у кампаніі восем вытворчасцяў, але іх спіс пашыраецца. «У нас ёсць шэраг праектаў у Салігорску і Пінску, якія цяпер на стадыі падпісання дагавораў і рэалізацыі. Гэта значыць мы павялічваем колькасць фабрык. Мы ўсё яшчэ шукаем новыя пляцоўкі, таму што на сёння мы можам прадаць больш, чым вырабіць».

Па словах Сяргея Егорава, адзін з асноўных момантаў, на які арыентуецца кампанія пры выбары месца, — гэта наяўнасць людскіх рэсурсаў, якія можна залучыць для працы. Не ў кожным горадзе знойдзеш кваліфікаваных швачак. Перш за ўсё глядзяць на кадры, якія працуюць ці навучаюцца ў гэтай галіне. Так, на заслаўскай фабрыцы працуе каля 300 чалавек, прычым не толькі ўласна з горада, але і з найбліжэйшых населеных пунктаў і са сталіцы. Усяго ў групе кампаній «Марк Фармэль» занятыя каля 2000 супрацоўнікаў. Сярэдняя заработная плата на філіяле — 900 рублёў. Для мінчан кампанія арганізуе праезд са сталіцы да Заслаўя. Падчас працоўнага дня можна зрабіць перапынак з кавай ці чаем за кошт кампаніі.

Чаму адны прадпрыемствы квітнеюць, а другія — наадварот? «Усё стратнае — гэта вынік дрэннага менеджменту, — лічыць Сяргей Егораў. — Кампанія, хутчэй за ўсё, пралічылася яшчэ на этапе, калі вырашалі, што, калі і як яны будуць выраблязь, або памылілася ў даследаваннях. У любым выпадку гэта працэс, якім можна кіраваць, ён не ідзе хаатычна. Нейкі менеджмент ёсць заўсёды, нават калі ты індывідуальны прадпрымальнік. Аадзінага рэцэпта для крызіснай сітуацыі ці стратнага прадпрыемства няма. З вытворчасцямі заўсёды трэба разбірацца ў індывідуальным парадку. Як паказвае сусветная практыка, простае абнаўленне нейкага прадпрыемства, якое выпускае незапатрабаваную прадукцыю, не вырашае пытанне. Прадукцыю ўсё адно не купляюць. Бізнес існуе для таго, каб даць чалавеку прадукт, які яму будзе цікавы, за цану, якую ён гатовы за яго плаціць. Не істотна, ці гэта фізічная асоба, ці гэта іншая вытворчасць. У любым выпадку ты павінен вырабляць тое, што цікавае, і тое, што канкурэнтаздольнае. Гэта два ключавыя фактары».

Расказваючы пра «Марк Фармэль», намеснік дырэктара гаворыць, што яны знаходзяць сваіх пакупнікоў у тым ліку дзякуючы цікаваму афармленню. На дзвярах у кабінет дызайнераў вісіць шыльдачка «Асцярожна, крэатыў!», і сапраўды, зрабіць звычайныя чорныя шкарпэткі можа кожны, а стварыць такія, якія хочацца набыць, — гэта амаль мастацтва. «Марк Фармэль» пачалі рабіць тое, чаго дагэтуль у Беларусі не было. Сакрэт у дробязях. Напрыклад, да іх рызінкі для валасоў заўсёды прывозіліся з-за мяжы. Кампанія заўсёды пашырае лінейку прадукцыі, і ў планах на гэты год запусціць выраб паліямідных калготак. Да таго ж у Заслаўі плануецца пабудаваць новы вытворчы корпус. Цяпер праект знаходзіцца на стадыі экспертызы.

«Марк Фармэль» стварае сабе імя і на міжнародным рынку. Усяго ўжо адкрыта 117 фірменных крам і 700 гандлёвых пунктаў. Працуюць як з краінамі СНД, так і з Заходняй Еўропай, ёсць запыты нават з Амерыкі. Для іх не існуе геаграфічных бар'ераў.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

# АДРАДЗІЦЬ ЗАВОД І ДАБІЦЦА ПОСПЕХУ

## Гісторыя станаўлення беларускай прыватнай кампаніі

**Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў межах паездкі ў Мінскую вобласць наведаў прадпрыемства «САЛЕО — кіруючая кампанія холдынгу», адно з аддзяленняў якога знаходзіцца ў Дзяржынску. Інвестары выкупілі стары завод у гэтым горадзе, адрамантавалі будынкі і наладзілі сур'ёзную вытворчасць гідраўлічнай прадукцыі. Карэспандэнт «МС» пагутарыў з намеснікам генеральнага дырэктара, дырэктарам па кадрах, рэжыме і ідэалогіі Генадзем ТУМЯЛЕВІЧАМ пра тое, як за такі кароткі тэрмін прадпрыемству ўдалося стаць на ногі і паспяхова працаваць у сучасных эканамічных умовах.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**— У 2011 годзе састарэлы маторарамонтны завод у Дзяржынску быў выкуплены прыватнікамі. Па сутнасці, з гэтага часу пачынаецца гісторыя «САЛЕО»...**

